УДК 355.233.231.1:821.161.3

# ФАРМІРАВАННЕ АСОБЫ НАВУЧЭНЦА Ў МЕЖАХ ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІН ФІЛАЛАГІЧНАГА ПРОФІЛЮ

А. В. ШАРАПАВА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

У артыкуле 17 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі пазначаны мэта і задачы выхавання ў сістэме адукацыі: «1. Мэтай выхавання з'яўляецца фарміраванне рознабакова развітой, маральна сталай, творчай асобы навучэнца. 2. Задачамі выхавання з'яўляюцца: 2.1. Фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі <…> » [1].

На занятках, а таксама ў пазааўдыторны час у межах вучэбных дысцыплін «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», «Культура і літаратура Еўропы», «Руская мова і культура маўлення» рэалізуецца ўзаемадзеянне разнастайных метадаў і прыёмаў навучання, якія дапамагаюць фарміраваць і развіваць у навучэнцаў вызначаныя якасці. Да прыкладу можна ўзгадаць некаторыя з вынікаў падобнай дзейнасці.

У снежні 2025 г. у Магілёўскім абласным тэатры лялек адбыўся спецыяльны паказ: больш за 200 студэнтаў Беларуска-Расійскага ўніверсітэта наведалі спектакль «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага». Пасля прагляду навучэнцы па прапанаваным прыкладным плане, а таксама з дапамогай выдадзеных выкладчыкам дадатковых матэрыялаў напісалі творчыя работы (стварэнне іх прадугледжана праграмай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)») у форме рэцэнзіі на спектакль.

Пры гэтым студэнты звярнулі ўвагу на тое, што спектакль пастаўлены па п'есе ўраджэнца Магілёва Сяргея Кавалёва (у суаўтарстве з Пятром Васючэнкам). Па сваёй рытміцы і стылістыцы пастаноўка шмат увабрала ад беларускай батлейкі – беларускага народнага лялечнага тэатра.

У спектаклі «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» перад маладымі гледачамі аўтары паставілі праблемнае пытанне: ісці шляхам гора-шляхціцаў ці абіраць іншае – працаваць, вучыцца, шукаць сваё месца ў жыцці. Навучэнцы, назіраючы за смешнай і разам з тым абсурднай сітуацыяй, калі выкананне панскіх жаданняў асэнсоўваецца як нешта празмернае і нелагічнае, зрабілі адпаведныя і правільныя высновы.

У лістападзе 2025 г. студэнты III курса напрамку падрыхтоўкі «Замежнае рэгіёназнаўства» пабывалі ў Свята-Мікольскім жаночым манастыры. Экскурсію правёў дырэктар Духоўна-асветніцкага цэнтра імя свяціцеля Георгія (Каніскага) Магілёўскай епархіі кандыдат філалагічных навук С. Э. Сомаў – іерэй манастыра.

Экскурсія праводзілася ў межах вучэбнай дысцыпліны «Культура і літаратура Еўропы». Студэнты ўбачылі выдатны помнік беларускай барочнай архітэктуры, даведаліся пра няпростую гісторыю манастыра ў кантэксце

еўрапейскіх рухаў Рэфармацыі і Контррэфармацыі, шматлікіх войнаў і рэвалюцый, а таксама пра яго адраджэнне ў канцы XX ст. Падчас экскурсіі прагучалі ода Г. Р. Дзяржавіна «Бог» («О ты, пространством бесконечный…»), фрагменты з «Боскай камедыі» Дантэ і іншыя лірычныя творы.

Такія сустрэчы дапамагаюць студэнтам глыбей разумець узаемасувязь беларускай культуры і літаратуры з агульнаеўрапейскімі тэндэнцыямі, а яшчэ выхоўваюць у іх пачуццё гонару за сваю родную краіну.

Правільнае патрыятычнае выхаванне маладога чалавека фарміруе любоў і павагу да роднай зямлі, сваіх суайчыннікаў, нацыянальнай спадчыны і сучасных дасягненняў. Але не менш важна развіць у навучэнцаў здольнасці і ўменні належным чынам прэзентаваць сваю айчыну перад прадстаўнікамі іншых краін. Таму адным з напрамкаў дзейнасці з’яўляюцца асветніцкія тэлемасты, што праводзяцца з міжнародным удзелам.

У лістападзе 2025 г. у Цэнтры рускай мовы і літаратуры «Пушкінскі цэнтр» адбыўся асветніцкі тэлемост «Расія – Беларусь – Казахстан: дыялог дружбы, дыялог культур» на тэму «Нацыянальная ежа: напоі, раслінныя і мясныя стравы». Беларускі бок прадстаўлялі студэнты-першакурснікі напрамку падрыхтоўкі «Замежнае рэгіёназнаўства».

Выступленні студэнтаў з маляўнічымі прэзентацыямі былі пранікненнем у мінулае краіны і адначасова адлюстраваннем сучаснай нацыянальнай кулінарыі. Кожная нацыянальная каманда паказала ўласны стыль. Беларусы, напрыклад, надалі вялікую ўвагу падрабязным рэцэптам і тэхналогіі прыгатавання традыцыйных страў: дранікаў і кулагі, зраз і верашчакі, бярозавага соку і маслёнкі.

Пасля прадстаўлення нацыянальных кухняў прайшла віктарына пра напоі, стравы і кулінарныя сімвалы. Беларускія студэнты занялі другое месца, зусім крыху саступіўшы прадстаўнікам РУДН.

Падобнага тыпу мерапрыемствы даюць магчымасць рэалізаваць як задачы вучэбнай праграмы па дысцыпліне «Руская мова і культура маўлення» (складаць тэксты на вызначаныя тэмы, рабіць прэзентацыі, рыхтаваць публічнае выступленне і ўзаемадзейнічаць з аўдыторыяй і інш.), так і папулярызаваць айчынную культуру праз разнастайныя культурныя коды.

Неабходна адзначыць, што працэс фарміравання асобы навучэнца павінен быць сістэмным, бесперапынным і цесна звязаным з яго вучэбнай дзейнасцю. Менавіта ў гэтым выпадку ён будзе найбольш прадуктыўным.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі : 13 студзеня 2011 г. № 243-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 снежня 2010 г. : адобр. Саветам Рэсп. 22 снежня 2010 г. : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 9 снежня 2025 г. № 110-З // Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. – URL: https: // pravo.by / document / ?guid=3871&p0=hk1100243 (дата звароту: 13.01.2026).